ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чырвоная Зьмена

№ 114 (1081) НЯДЗЕЛЯ, 18-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Разгром левых профсаюзных організацый

ВАРШАВА, 16. Разгром левых профсаюзных організацый у Варшаве працягваецца. Учора зачынен паліцыяй левы профсаюз рабочых абутковай прамысловасьці ў Варшаве, які праводзіць якраз цяпер забастоўку. Забастоўка гэта сыстэматычна зрываецца другім профсаюзам абутнікаў, якім кіруюць бундаўцы. На гэтай глебе апошнія дні адбылося шмат сутычак паміж бастуючымі і штрэйкбрэхерамі. У сувязі з зачыненьнем на працягу двух дзён трох профсаюзных організацый, учора адбылося некалькі дэманстрацый. Пры сутычках рабочых з паліцыяй некальні рабочых было паранена, адзін з іх цяжка.

ГАРАЧАЕ КОМСАМОЛЬСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ВЫШЭЙШАМУ ОРГАНУ МЕНСКАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б—VIII АКРУГОВАЙ ПАРТЫЙНАЙ КОНФЭРЭНЦЫІ

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

Да VIII акруговай парт. конфэрэнцыі Менская організацыя КП(б)Б прыходзіць ідэйна згуртаваная навокал генэральнай лініі і яе ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б

(З артыкулу бюро Менскага Акруговага камітэту КП(б)Б).

VIII-я акруговая партыйная конфэрэнцыя, якая зьбіраецца ў адказьнейшы пэрыод соцыялістычнага будаўніцтва самакрытычна падвядзе вынікі дасягненьняў, за паўтара гады ўпартай бальшавіцкай работы, партарганізацыі, выявіць найбольш слабыя зьвеньні ў нашай рабоце і намеціць практычныя мерапрыемствы, якія забясьпечаць далейшае пасьпяховае соцыялістычнае будаўніцтва на аснове генэральнай ленінскай лініі партыі.

Мобілізуючы партыйную організацыю на далейшае разгортваньне ініцыятывы рабочае клясы, забясьпечаньне цьвёрдага кіраўніцтва і ўсямернага разьвіцьця соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, як найлепшых мэтадаў у ажыцьцяўленьні прамфінпляну і хутчэйшай перабудовы партыйнай і профсаюзнай работы, у хутчэйшым правядзеньні ў жыцьцё адзінаначальля,—мы павінны будзем у працягу 2-га паўгодзьдзя перакрыць недавыкананьне прамфінпляну за 1-е паўгодзьдзе і дабіцца выкананьня і перавыкананьня яго.

Накіраваць усе сілы на далейшае нязкладнае, рашучае выпраўленьне скрыўленьняў партыйнай лініі ў галіне колектывізацыі, перабудову работы з тым, каб час, які застаўся, быў максымальна выкарыстан для работы па правядзеньню вясеньняга севу, у колгасна-савгаскім і індывідуальным бядняцка-серадняцкім сэктары, для замацаваньня створаных колгасаў, для організацыі вытворчай актыўнасьці індывідуальных бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, організуючы яе праз прасьцейшыя формы коопэраваньня, для працягненьня разгортваньня барацьбы за далейшы ўздым сельскае гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва як клясы, на падставе суцэльнай колектывізацыі праз ізоляцыю кулацтва і ліквідацыю кулацкіх гаспадарак на падставе суцэльнай колектывізацыі асобных вёсак і раёнаў, на сконцэнтраваньне большай увагі па рабоце з беднатой, організацыю ў самы кароткі тэрмін батрацка-бядняцкіх груп у тых колгасах, дзе яны яшчэ ня створаны, на рашучы пералом у галіне ўцягненьня батрацтва ў колгасы.

Партарганізацыя павінна з непаслабнай энэргіяй працягваць рашучую барацьбу з усякімі адхіленьнямі ад ленінскай лініі партыі ў нацыянальнай політыцы, як з нацыянал-дэмократызмам — агентурай беларускага кулацтва, якое выконвае заданьні польскага і беларускага фашызму, так і з шовінізмам розных колераў (яўрэйскага, польскага, расійскага і інш.). Узмацніць тэмп беларусізацыі ў партыйных, профсаюзных, коопэрацыйных і інш. грамадзкіх організацыях, імкнучыся к таму, каб беларусізацыя атрымала шырокае распаўсюджаньне сярод рабочых мас, за ўкладаньне і поўнае кіраўніцтва беларускай культурай, як адным з важнейшых сродкаў узмацненьня кіраўніцтва бядняцка-серадняцкімі масамі вёскі з боку рабочае клясы. За ўзмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. На забясьпечаньне рабочых прадуктамі, гэтым самым падвышаючы рэальную зарплату рабочага, шляхам павялічэньня ахопу бюджэту рабочага коопэрацыяй, організацыі прыгарадных гаспадарак і інш.; на ўзмацненьне работы спажыўкоопэрацыі па вёсцы ў першую чаргу ў колгасным сэктары, у прыватнасьці ў галіне організацыі грамадзкага харчаваньня, далейшай рацыяналізацыі апарату і крамнай сеткі, да ўзмацненьня культасьветнай работы, пераходу на бесьперапынку, падрыхтоўкі каапэрацыйных кадраў з батрацтва, беднаты і калгасьнікаў.

Падрыхтоўка капіталістычным сьветам вайны супроць СССР—у цэнтры ўвагі партыйнай організацыі, якая з ўсёй рашучасьцю ставіць задачу і на далей узмацняць баяздольнасьць часьцей Чырвонай Арміі і ваенізацыю працоўнага насельніцтва для падрыхтаванасьці да абароны краіны Саветаў, выхоўваючы чырвонаармейцаў і працоўных у духу самаахвярнай адданасьці справе пролетарскай рэволюцыі.

Зьвярнуць большую ўвагу на палепшаньне быту чырвонаармейцаў і начальніцкага складу. Усямерна палепшыць садружаства паміж рабочымі і Чырвонай арміяй і ўзмацніць ўплыў на чырвонаармейскія масы. Пры комплектаваньні Чырвонай арміі прыняць меры к недапушчаньню соцыяльна-чужых элемэнтаў у РСЧА.

Работа сярод працоўных жанчын павінна стаць аднэй з галоўнейшых задач партыйнай організацыі.

Неабходна ўзмацніць кіраўніцтва саветамі, накіраваўшы галоўную іх ўвагу на выкананьне асноўных задач, якія стаяць перад рабочай клясай і бядняцка-серадняцкім і калгасным сялянствам, узмацніць працу камісій пры саветах, уцягнуць ў іх шырокія масы працоўных, разгарнуць масавую працу Саветаў і павялічыць удзельную вагу батрацка-бядняцкіх груп ў працы Саветаў.

Гарадзкія Саветы павінны ўзмацніць практыку пасылкі членаў Саветаў на сталую працу ў с-саветы, прыняцьце шэфства над с.-саветамі і пасылку рабочых брыгад для ўзмацненьня савецкага будаўніцтва на вёсцы.

Парторганізацыя павінна з неаслабнай энэргіяй працягваць узмацненьне кіруючых кадраў па ўсіх галінах партыйнай, савецкай, профсаюзнай і гаспадарчай работы, вылучаючы рабочых з вытворчасьці на кіруючую работу, з усёй рашучасьцю замяняючы тых з кіруючых работнікаў, якія ня здольны праводзіць правільную бальшавіцкую лінію, праяўляюць хістаньні, няздольны перамагаць цяжкасьцяй і кіраваць масамі.

Для ажыцьцяўленьня задач па лініі сельскай гаспадаркі, неабходна больш узмацніць працу ў галіне падрыхтоўкі пролетарскіх кадраў, вылучэнцаў з батрацка-бядняцкіх груп у якасьці кіраўнікоў асобных колгасаў, савгасаў і іх аб'яднаньняў.

У кіраўніцтве работай профэсыйных саюзаў зьвярнуць большую ўвагу на хутчэйшую перабудову профэсыянальнымі саюзамі сваёй працы ў адпаведнасьці з тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва, накіраваўшы галоўную ўвагу саюзаў на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ў прамысловасьці акругі. Адначасова профэсыянальныя саюзы павінны павялічыць увагу якасным паказчыкам ходу соц. спаборніцтва і ўдарнага руху, ажыцьцяўленьню дырэктывы партыі аб правядзеньні адзінаначальля ў сэнсе падвышэньня адказнасьці кожнага гаспадарчага працаўніка за сваю працу, перабудова масавай культурна-політычнай работы ў напрамку выхаваньня шырокіх рабочых мас на выкананьне асноўных задач, якія стаяць перад партыяй і профэсыйнымі саюзамі па лініі індустрыялізацыі і колгаснага будаўніцтва. На ўзмацненьне парткіраўніцтва комсамолам, палепшаньне складу кіруючых кадраў комсамольскай організацыі, большае ўцягненьне комсамолу ў работу выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, па соцыялістычн. спаборніцтву і ўдарнаму руху.

У асяродку работы комсамолу высунуць задачу далейшай мобілізацыі ўсёй організацыі на барацьбу за генэральную лінію партыі, актыўнейшы ўдзел комсамолу ў палепшаньні якасьці работы на прадпрыемствах, організацыю працы і вытворчасьці ў колгасах, пасьпяховае заканчэньне веснавой сяўбы як у колгасах, так і ў індывідуальным бядняцка-серадняцкім сэктары, за ўцягненьне 100 проц. рабочай і батрацкай моладзі ў шэрагі комсамолу, мобілізацыю комсамольскіх мас на барацьбу з ухіламі ад ленінскай лініі, з нацыянал-опортунізмам, беларускім нацыянал-дэмократызмам і шовінізмам розных колераў, а таксама з прымірэнцтвам да ўхілаў.

Рашучае разгортваньне самакрытыкі і ўнутры-партыйнай дэмократыі застаецца актуальнейшай задачай парторганізацыі. Разгортваньне самакрытыкі і ўнутры-партыйнай дэмократыі зьяўляецца лепшым сродкам перабудовы работы нашых організацый і прыстасаваньня яе да тэмпаў рэконструкцыйнага пэрыяду, палепшаньня мэтадаў кіраўніцтва масамі; лепшым спосабам для далейшага росту партыі ў рабочых раёнах і ў вёсцы; лепшым сродкам барацьбы супроць опортуністычных ухілаў і прымірэнцтва да іх.

Далейшае ўцягненьне ў партыю рабочых ад варштату, с.-г. рабочых, батракоў, беднякоў, лепшых колгасьнікаў, жанчын-работніц, батрачак, бяднячак-колгасьніц, якія апраўдалі сябе прыкладнай работай на вытворчасьці і на грамадзкай рабоце, а таксама стварэньне партячэек ва ўсіх савгасах і ў буйнейшых колгасах—застаецца цэнтральным месцам ў рабоце нашай організацыі.

Пашырэньне і якаснае палепшаньне пропаганды марксызму-ленінізму, бальшавіцкае выхаваньне парторганізацыі, асабліва партыйна-гаспадарчага і профсаюзнага активу ў мэтах ліквідацыі разрыву паміж тэорэтычным узроўнем активу і адказьнейшымі задачамі штодзённай практычнай работы—застаецца аднэй з актуальнейшых задач парторганізацыі ў сучасных умовах.

Менская акруговая партыйная організацыя і на далей застанецца монолітнай бальшавіцкай організацыяй, і пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б павядзе шырокія масы рабочых і працоўнага сялянства да новых рашучых боек за канчатковую пабудову соцыялізму ў нашай краіне.

Бюро АК КП(б)Б.

Тэлеграмы

Фашысцкі напад на дэпутатаў беларускага рабоча-сялянскага блёку

ВАРШАВА, 16. У Лідзкай акрузе, дзе ідзе прадвыбарчая агітацыя, у сувязі з надыходзячымі хутка выбарамі ў сойм, падпарадкваліся нападу фашысцкіх дружын і пераапранутых шпікаў дэпутаты беларускага рабоча-сялянскага блёку. Дружыньнікі напалі на іх у той час, калі яны пасьля мітынгу ішлі на станцыю чыгункі. Відавочна, зьбіеньне рэволюцыйных дэпутатаў шпікамі, пад відам абуранага натоўпу, узьведзена зараз у сыстэму

Тэрорызацыя кіраўнікоў кампаніі па збору сродкаў на трактор СССР

ПРАГА, 17. Чэха-Славацкая паліцыя праяўляе выключную ўвагу кампаніі па збору сродкаў на трактар СССР, якая праводзіцца рэволюцыйнымі рабочымі. Кіраўнікі гэтай кампаніі выклікаюцца ў паліцыю і розным чынам тэрорызуюцца.



Пад шыльдаў „разброеньня“ буржуазія будуе новые броненосцы

Рэдактары „Рудэ Прово“ знаходяцца ў турме

ПРАГА, 17. Амаль усе рэдактары цэнтральнага органу партыі Чэха-Славакіі „Рудэ Право“ знаходзяцца ў турме.

Беспрацоўе у Польшчы

ВАРШАВА, 16. Рост руху сярод беспрацоўных тлумачыцца надзвычайна цяжкім становішчам беспрацоўных. На першае красавіка было афіцыйна зарэгістравана 291 тыс. беспрацоўных. Агульную колькасьць беспрацоўных пэпэсаўскі орган „Рэпублік“ ацэньвае ў 400 тысяч, што разам з членамі сямей складае армію галадаючых у 1600 тысяч чалавек.

Францускія аэропляны для мукдэнскага ўраду

ТОКІЁ, 16. Японскія газэты, якія выдаюцца ў Дайрэне, паведамляюць, што Мукдэн ліхаманкава ўзбройваецца. На днях у Дайрэне адгружана для мукдэнскага ўраду 7 францускіх аэропляnaў навейшай канструкцыі. З Францыі запрошаны лётнікі і спэцыялісты па лётніцтву.

Арыштаваныя комуністыя прыгавораны да растрэлу

ТОКІЁ. 15. Па словах японскай газэты „Ціосюн-Цзіцючэо“, якая выдаецца ў Чанчуне, нядаўна арыштавана ў Мукдэне група комуністых. Усе арыштаваныя прыгавораны да растрэлу.

Вышаў забаронены бюлетэнь

ЛЁНДАН, 17. Забаронены ўладай бюлетэнь Бомбэйскай організацыі нацыянальнага конгрэсу сёньня вышаў у Бомбэі. У бюлетэні аб'яўлена, што ён будзе выходзіць, ня гледзячы на забарону. Двое прадаўцоў бюлетэню арыштаваны.

Адкрыўся 7 пленум ЦК УсеЛКСМ

МАСКВА, 15 мая у вялікім крэмлеўскім палацы (у Аляксандраўскай залі) адкрыўся 7 пленум ЦК УсеЛКСМ.

У БАРАЦЬБЕ ЗА КАДР[Ы]

Профтэхшколы—пасынкі Наркомасьветы

Яны да гэтага часу ня маюць належнай увагі, дапамогі і кіраўніцтва з боку органаў асьветы і працы.

Яны не забясьпечаны належнымі настаўніцкімі кадрамі, якія былі-б здольны падрыхтаваць сапраўдныя тэхнічныя кадры для растучай прамысловасьці

Галавацяпскім, бюрократычным адносінам да нашых профшкол павінен быць палажан канец!

НКА БССР, Бабр. АІНА—ваша слова!

Рагачоўская дрэваапрацоўчая профшкола, якая адчынілася ў мінулым годзе, была пастаўлена спачатку ў вельмі дрэнныя ўмовы. З цягам часу школа становіцца на ногі, дзякуючы ўпартасьці загадчыка школы. Мясцовыя органы—Горсавет і Гарпо—спачатку глядзелі і зараз глядзяць на гэту школу, як на школу першай ступені. Яны зусім забываюцца, што патрэбны рабочыя і тэхнічныя працаўнікі для социялістычнага будаўніцтва. Дабрабыт прафшкольцаў з кожным днём ня толькі не палепшаецца, але пагаршаецца, што выклікае вельмі вялікі адсеў са школы. Летась на першым курсе ў кастрычніку м-цы было 45 студэнтаў, сёлета-ж налічваецца—34.

Стыпэндый не хапае для жыцьцёвага мінімуму, бо Гарпо не адпускае ільготных абедаў. Студэнтам прыходзіцца самім варыць страву, мыць бялізну і выконваць програмную працу, як ў школе, так і ў майстэрні.

Студэнты ў студзені месяцы дабіліся інтэрнату, але ён зусім не адпавядае запатрабаваньням студэнства. як сваім, памерам, так і абсталяваньнем.

КАЛІ У САКАВІКУ СТУДЭНТЫ ПАСЛАЛІ ЗАЯВУ ЗА 30 ПОДПІСАМІ АКРУГОВАМУ ІНСПЭКТАРЫЯТУ НАРАСЬВЕТЫ, У ЯКОЙ ЯНЫ ПЫТАЛІСЯ Ў ІНСПЭКТАРА: „ЦІ ЖАДАЮЦЬ З НАС ЗРАБІЦЬ СУХОТНЫХ, ХВОРЫХ ЦІ КАРЫСНЫХ ЛЮДЗЕЙ ДЛЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА?“ .заява была падкладзена пад сукно і засталася без адказу. Даволі такіх бюрократычных адносін да справы!

НАРОДНЫ КАМІСАР АСЬВЕТЫ БССР! БАБРУЙСКІ АКРУГОВЫ ІНСПЭКТАР НАРОДНАЕ АСЬВЕТЫ! Зьвярнеце ўвагу на палепшаньне матар'яльнага становішча студэнцтва ў Рагачоўскай дрэваапрацоўчай профшколе! Чакаем вашага слова.

8 **подпісаў.**

Словы... і справы

Шмат было разважаньняў і гутарак аб палепшаньні вучэбнай **практыкі механічнай майстэрні Гомельскай прафтехшколы мэталістых. Але на сёньнешні дзень палепшаньня ня відаць. У майстэрні** панакіданы і валяюцца ўсякія дэталі, апцечкі пустуюць.

Пасьля сканчэньня працы трансмісія не адпачывае, інструктары і іншыя працуюць на пабочных заказах і часта пры нагрузцы двух-трох варштатаў пускаюць у ход усю трансмісію.

Нам прыходзіцца працаваць без інструктажу, бо адзін інструктар паехаў у Крым, а другі працуе ў першай клясе. Шмат добрых прапаноў ня выконваюць. Напрыклад, вучні прапанавалі ўстанавіць дробны наждачны камень, паставіць бакі з вадой пад сьвідравальныя варштаты і г. д.

Бюро ячэйкі сьпіць, бо ня бачыць, ня цікавіцца справамі зьнішчэньня недахопаў. Вытворчая нарада ніякай працы не праводзіць. Кіраўнікі ўдарніцтвам вывесілі лёзунгі, чорную дошку, дошку браку, але ніякай практычнай працы не праводзяць, бо няма кіраўніцтва з боку належных партыйных органаў.

Л. Кавалярысты.



З соракаградуснай ён выхоўвае профшкольцаў

Са знакам мінус

„... Добры дзень, паважаны таварыш рэдактар „Чырвонай Зьмены“. Я, вучань Коханаўскай професыйнай вучэбнай майстэрні, пішу вам першы артыкул у „Чырвоную Зьмену“ пад назвай: „Як ідзе вучоба Коханоўскай майстэрні“. Першае мы павінны адзначыць, што вучоба 1930 году ідзе ў адваротны бок са знакам мінус. .“

Так пачынаецца допіс юнкора „Малаток“, вынуты з груды юнкораўскіх допісаў, якія ляжаць у папцы пад звычайнай кароткай назвай—„Профшкольскія“. Гэта папачка штодзённа павялічваецца. Кожны раз яна таўсьцее за кошт новых допісаў, новых лістоў і запытаньняў.

Профшкольская моладзь добра зразумела тыя задачы, якія пастаўлены перад ёю ў справе падрыхтоўкі для нашай вытворчасьці належных рабочых кадраў.

З груды профшкольскіх лістоў адзін за адным усплываюць твары нашых профшкол. Вельмі рэдка ў вочы кідаецца заметка аб добрай працы, аб нормальным ходзе вучобы. Нават такой заметкі і не спаткаеш. Так, юнкор „Малаток“ у тым-жа допісе піша:

„... З самага пачатку навучальнага году працы зусім ніякай ня было. Майстры адносяцца да гэтага вельмі кепска. Калі папросіць вучань працы, дык ён махне рукой, ды і вышаў. Так вучань і застаецца бяз працы. Гуляе цэлы дзень, ды і ня толькі дзень, але і ўвесь год, і ня толькі адзін вучань, але ўсе вучні...“

З такім халадком адносяцца кіраўнікі школ да справы кваліфікаваньня вучняў. Гэты факт не адзіночны. Па цэлым шэрагу профшкол мы назіраем тое-ж самае. Шматлікія факты сьведчаць аб тым, што справа кваліфікаваньня, набыцьця практычных звычак знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Трэба адзначыць крытычнае становішча ў справе забясьпечаньня профшкол настаўніцкімі кадрамі. Па ўсіх школах не хапае належных настаўніцкіх кадраў. прычым настаўнікі, якія працуюць у школах, яшчэ ня зусім апраўдваюць сваё прызначэньне.

„... У Менскай аб'яднанай профшколе загадчык навучальнай часткі, а разам і настаўнік па грамадазнаўству тав. Сьвірыдовіч зьяўляецца для вучняў нейкай пагражаючай ценьню...“.

Так піша „Профшколец“ у сваім допісе: „Гнаць гэткіх настаўнікаў з савецкай школы“. А юнкор Н. А. піша:

„... Загадчык Менскай профшколы будаўнікоў Нарэйка—у школе нічога ня робіць. Ён ня ведае, што робіцца ў майстэрнях, ніколі не заглядае туды і не дае напрамку інструктарам у іх працы. Сам, як загадчык, зрывае соцпаборніцтва, прапушчаючы галоўныя дысцыпліны ў профшколе, як красьленьне, скіцырваньне і г. д., на лекцыі альбо зусім ня прыходзіць, альбо на поўгадзіны спазьняецца...“

„... Сам п'янствуе, на лекцыі прыходзіць п'яным. З вучнямі, калі гаворыць, дык галаву трымае ў профіль, каб ня выдаць сябе. Школе нічога ня даў добрага, акрамя дрэннага. Вучням сорамна зайсьці ў габінэт самога загадчыка, бо бутэлькі ад розных сьпіртавых напіткаў ты там толькі і заўважаеш...“.

Гэтым п'яніцам даручана выхаваньне нашых будучых кадраў. Гэтыя Нарэйкі і іншыя, яму падобны, будуць падрыхтоўваць патрэбныя кадры для нашай растучай прамысловасьці.

Усякая барацьба з гэтымі недахопамі, усякае праяўленьне самакрытыкі некаторыя „гора-кіраўнікі“ сустракаюць у поўным узброеньні, даюць падрыхтованы адпор.



Што там, вучоба?—Усё ведаю!

Вось, як піша аб гэтым „Юнкор“:

„...Насьценгазэта ў гэтым напрамку засталася на пункце замярзаньня. І зразумела, бо з боку некаторых грамадзкіх працаўнікоў быў самы сапраўдны заціск самакрытыкі. Былі выпадкі. калі насьценкора, члена бюро ячэйкі КСМ, старшыню самакіраваньня тав. Шустэрмана за крытычную заметку, кіраўнік колектыву—Пуплікаў, стукаючы кулаком, пагражаў: „Я табе пакажу!...“ і г. д.

Той самы Пуплікаў, сэкратар ячэйкі, так званы „галоўка“, таксама [...] сьценкору, пісаўшаму аб яго [...] дзінах, сказаў:—Глядзі ты ў мяне [...] падзеш на школьную раду!“.

А колькі крыку падымаў т. Пу[плі]каў з рэдактарам насьценгазэты: „Чаму не сагласавалі“? і г. [д.]

Ня гледзячы на ўсё гэта, ком[са]мольская ячэйка стаіць у баку. [На]ват той-жа Пуплікаў.

„...на выклік аднаго з тавары[шоў] на лепшую працоўную дысцы[пліну] праз насьценгазэту, раззлаваўшы[ся] адказаў: „Як гэта беспартыйны [...] не сэкратара ячэйкі-выклікае на с[о]спаборніцтва? Зараз-жа зьняць [вы]клік!!!“ . — і над націскам Пу[плі]кава выклік быў зьняты“?

Гэтыя факты не адзіночны. [...] лепш, а нават горш, абстаіць спр[ава] ў аб'яднанай Крычаўскай проф[...] школе. Тут ячэйка зусім здала с[вае] пазыцыі. Ніякай працы не вядзе[цца], нічога ніхто ня робіць.

Так, многія з нашых проф[школ], прызваныя падрыхтоўваць квалі[фіка]ваныя рабочыя кадры, ня здолелі [на]лежным чынам разгарнуць сваю пр[ацу].

Нашыя комсамольскія ячэйкі [...] не прывучыліся да штодзённага к[іраў]ніцтва жыцьцём профшкол. Яшчэ [не] навучыліся па-сапраўднаму раз[гортваць] сваю працу па ўцягненьню мо[ладзі] ў КСМ.

Нашы настаўнікі не адпавяда[юць] яшчэ свайму прызначэньню. Яны [не] могуць належным чынам паста[віць] выхаваньне нашых будучых р[або]чых кадраў.

Кожны дзень мы атрымоўваем гр[у]ды допісаў юнкораў, якія паве[дамля]юць аб недахопах, што пануюць у школах.

Становішча нашых профшкол [па]вінна быць палепшана. Галава[цяп]скія адносіны да нашых профш[кол з] боку органу Народнай Асьветы і [ін]шых устаноў павінны атрымаць [на]лежны адпор. Нашы профшколы [па]вінны мець добры пэдагогічны с[клад], які сапраўды адпавядаў-бы паста[ўле]ным задачам у справе падрыхт[оўкі] кадраў.

Сучасным становішчам нашых [...] трэба заняцца з тым, каб яны са[праўд]ы маглі спраўляцца з пастаўле[нымі] перад імі задачамі, а профшко[льная] папачка зьмяніла кірунак са [знакам] мінус—на плюс.

А. ГЛЕЗЕ[Р]

Усяго 28 лекцый

Сьмілавіцкая профшкола (Менская акруга) адчынілася 25 лют[ага] г. г., але з таго часу яшчэ ніякай працы ў школе не вядзе[цца]. За месяц было ўсяго 28 розных лекцый, а ў сьлесарным цэху нія[кіх] заняткаў яшчэ ня было.

Інтэрнату вучням не даюць. Ёсьць пакой на 10 чалавек, [...] страву сварыць недзе, бо няма кухні, няма дроў. Вучні паляць до[...] з ложкаў. Шмат вучняў кідаюць школу, дзякуючы несваечасовай вы[...] плаце стыпэндыі. Сярод вучняў не вядзецца ніякай выхаваўчай пра[цы].

Становішчам профшколы трэба зацікавіцца. 4 вучн[і]

Сапрауды паказальная

У кастрычніку месяцы мінулага году ў Рагачове адчынілася дрэваапрацоўчая профшкола, у якую залічылі 40 студэнтаў. Цяжка было спачатку праводзіць працу, бо памяшканьне было дрэннае. Упартай працай загадчыка **Гэрмана** *і саміх студэнтаў цяжкасьці былі пераможаны. Зараз яна зьяўляецца аднэй з лепшых школ на Бабруйшчыне.*

Пры школе організавалі комсамольскую ячэйку, якая па моцы зьяўляецца другой у горадзе. Студэнты паўсядзённа дапамагаюць падшэфнай вёсцы. Яны разьбіліся на брыгады, і праводзяць у вёсцы вечары, вышлі ў колгас „Пабеда“ і наладзілі ўвесь паламаны інвэнтар.

Школа вызвала на соцыялістычнае спаборніцтва ўсе профшколы Бабруйску.

Ш. М.

МЫ ПЫТАЕМ

Вучні Смальнянскай сельска-гаспадарчай профтэхшколы з самага пачатку навучальнага году патрабавалі ад школьнай адміністрацыі, каб яна паклапацілася перад Днепсаюзам альбо спажывецкім таварыствам аб водпуску вучням хоць якіх-небудзь тавараў з спажывецкага таварыства.

Школьная адміністрацыя абмежавалася абяцанкамі.

Вучні ходзяць у падранай вопратцы. Вышэйшыя органы школы аб гэтым ня турбуюцца і пытаньнем забясьпечаньня вучняў зусім не займаюцца.

Хто вінаваты ў гэткіх непарадках ў школе? Хто павінен патурбавацца аб дабрабыце вучняў і наогул школы? Хто павінен хоць раз у год зрабіць абсьледваньне данай школы?

Цыбуля.

Да Міжнароднага Дзіцячага Тыдню

З 18-га па 25-га мая праводзіцца Міжнародны Дзіцячы Тыдзень. У гэтым годзе „Тыдзень“ саўпадае з дзесяцігодзьдзем Дзіцячага Комуністычнага Руху, што набывае выключнае значэньне.

Гэты „Тыдзень“ зьяўляецца аглядам і мобілізацыяй дзіцячых сіл да II-га Міжнароднага Зьлёту пролетарскіх дзяцей 13-18 чэрвеня ў гор. Гальле (Нямеччына).

Міжнародны Дзіцячы Тыдзень у гэтым годзе праходзіць у абставінах яшчэ больш узмацняючагася белага тэрору ў краінах капіталу, калёніях і паўкалёніях супроць рэволюцыйных сіл пролетарыяту і з асаблівай жорсткасьцю накіраванага супроць пролетарскіх дзяцей. Збойствы, арышты і пасадка ў турмы піонэраў і школьнікаў сталі звычайным мэтадам „выкарчоўваньня“ рэволюцыйных ідэй, якія захапілі падрастаючае пролетарскае пакаленьне (Гары Эйсман—Амэрыка).

Асабліва цкуюцца дзеці ў калёніяльных краінах, дзе пануе жорсткая, нячуваная эксплёатацыя дзіцячай працы. На тэкстыльных фабрыках у Кітаі работніцы прымушаныісьці на працу з дзецьмі, бо ў хатах няма каму за імі глядзець. З 5 год дзеці ў Кітаі ідуць на фабрыку выконваць непасільную працу.

У Міжнародны Чырвоны Дзень—1-га жніўня, у Міжнародны Дзень Беспрацоўя—6-га сакавіка, піонэры і школьнікі таксама прымалі ўдзел. Дэмонстрацыі, забастоўкі вучняў у Амэрыцы, конфэрэнцыі пролетарскіх дзяцей у Нямеччыне. Протэсты піонэраў і школьнікаў у шэрагу іншых краін супроць антысавецкай політыкі буржуазных дзяржаў.

Ня менш важным у „Тыднёвіку“—гэта ажыўленьне шэфскай сувязі з політ-зьняволенымі і іх дзецьмі, якія жывуць у замежных дзіцячых дамох МОПР'у (Эльгесбург, Баркэнгоф—Нямеччына) і з дзецьмі політ-зьняволеных і забітых рэволюцыянэраў, якія выхоўваюцца ў нас у СССР (дзеці забітых рэволюцыянэраў выхоўваюцца ў Гомелі і ў Віцебску) і з дзецьмі рэволюцыянэраў, якія знаходзяцца ў Інтэрнацыянальным Дзіцячым Доме „Чырвоны Дзень“ (каля ст. Лопасьня ў 80 клм. ад Масквы). Усе піонэры і школьнікі павінны ведаць аб жыцьці гэтых дзяцей і прыняць шэфства над дзіцячымі дамамі Мопру.

Неабходна шырока разгарнуць работу гурткоў Юных Сяброў Мопру і ўцягненьне пролетар[скіх] дзяцей у гэтую організацыю, хоўваючы іх так, каб усяляк [дапамагчы] сьці ім на дапамогу.

У час „Тыднёвіку“ організа[цыям] Мопру, разам з аддзеламі Н[ароднай] асьветы і піонэр організа[цыямі] трэба правесьці інтэрнацыяна[ль]ныя конфэрэнцыі ЮДМ разам з членамі ЮДМ, прапрацаваўшы пытаньні аб рабоце ЮДМ, аб [ін]тэрнацыянальным выхаваньні [у] школе і ў організацыях ЮДМ, [дзе]якіх ехалі на Усесаюзную Экс[кур]сію Конфэрэнцыю (Менск—Гомель) —дэлегаты павінны інформа[ваць] аб удзеле іх у працы конфэр[эн]цыі і рашэньнях конфэрэнцыі, [пра]весьці дзіцячыя ранішнікі з [...] тацкай часткай, асьвяжаць но[вымі] матар'яламі куткі Мопру, там [дзе іх] няма—організаваць такія. У „Тыднёвіку“ гарадзкім гурт[кам] ЮДМ трэба прыняць шэфства [над] колгаснымі, савгаснымі і вяск[овымі] гурткамі ЮДМ.

І на ўзрастаючы белы тэрор, [на]кіраваны супроць пролетар[скіх] дзяцей „Юныя Сябры Мопру“ [па]вінны адказаць бадзёрым піон[эр]скім заклікам—„Заўсёды гатовы [ака]заць дапамогу замежным [про]летарскім дзецям, бацькі якіх [...] ў барацьбе за вызваленьне [пра]цоўных мас усіх узростаў і [па]леньняў“.

Л. Леві[н]



ДА УСЕБЕЛАРУСКАГА ПОЛІТ-БОЮ

Агонь па правым опортунізьме

не зьмяншаючы барацьбы з „левымі“ крыкунамі і прымірэнцамі

Пад шыльдай вывучэньня марксыцка-ленінскай тэорыі „гора-кіраўнікі“ політбою з Гомелю прапаведвалі права-опортуністычныя тэорыі, дэзорыентавалі масу комсамольцаў у пытаньнях політыкі партыі

НЕАДКЛАДНА МОБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ КОМСАМОЛЬЦАЎ І ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ НА ВЫПРАЎЛЕНЬНЕ ДАПУШЧАНЫХ ПАМЫЛАК

ПАД ШЫЛЬДАЙ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ТЭОРЫІ

„ВЫКРЫЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧНЫ КОЛЕР ОПОРТУНІЗМУ

Пытаньні тэорэтычнага руху ў комсамоле займаюць адно з важнейшых месц ва ўсёй нашай рабоце. Асноўная думка, якая ўкладзена ў весь гэты зьмест, заключаецца ў тым, што „няма рэволюцыйнай практыкі без рэволюцыйнай тэорыі“. Злучэньне двух гэтых важнейшых зьвеньняў зьяўляецца асноўным мэтадам у рабоце комсамольскай організацыі.

Уся каштоўнасьць нашай вучобы месьціцца іменна ў тым, наколькі мы ўсёй масай комсамольцаў зможам зьвязаць рэволюцыйную тэорыю з рэволюцыйнай практыкай. Практычнае ажыцьцяўленьне важнейшых політычных пытаньняў, якія стаяць перад комсамольскай організацыяй, як: барацьба за прамфінплян, барацьба за соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі, пытаньні ажыцьцяўленьня генэральнага лёзунгу партыі— ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай колектывізацыі, рашучая барацьба на ідэолёгічным фронце, непрымірючая, жорсткая барацьба за генэральную лінію партыі, з концэнтрацыяй агня на правым, як больш небясьпечным, ухіле, не зьмяншаючы барацьбы з „левымі“ загібамі і прымірэнцтвам да іх—немагчыма без рэволюцыйнай тэорыі.

Адсюль зусім зразумелым становіцца той факт, што пытаньні рэволюцыйнай тэорыі ў рабоце камітэтаў комсамолу павінны займаць віднае месца.

Падрыхтоўка да ўсебеларускага політ-бою, якая праходзіць ва ўсёй організацыі комсамолу, зьяўляецца значным штурхачом для ўсёй комсамольскай організацыі, для далейшай, яшчэ больш упартай, работы па аўладаньню марксыцка-ленінскай тэорыяй. Пасьпяховасьць вырашэньня гэтага складанага пытаньня будзе залежыць ад таго, наколькі мы зможам своечасова мобілізаваць масы, наколькі мы закладзем моцны фундамэнт у сэнсе папярэдняй падрыхтоўкі ўсёй організацыі, наколькі мы забясьпечым організацыю ўсімі неабходнымі ўмовамі для далейшай вучобы.

Ажыцьцяўленьне ўсіх гэтых задач немагчыма бяз увязкі рэволюцыйнай тэорыі з рашучай барацьбой з праявамі рознага роду опортунізму, прадстаўнікі якога іншы раз пад рознымі шырыкамі пралязаюць і ў комсамольскую організацыю:

Надзвычайна характэрным і паказальным у гэтых адносінах зьяўляецца прайшоўшы нядаўна (20 красавіка) політбой у Гомельскай гарадзкой організацыі комсамолу, дзе пад выглядам рэволюцыйнай тэорыі працягваліся опортуністычныя погляды.

Для таго, каб ня быць голаслоўным, дамо слова фактам, папярэдня азнаёміўшы чытача з букетам асоб, якія называлі сябе штабам па правядзеньню політбою.

Мы там знаходзім даволі адказных асоб: **Слуцкі, — дырэктар тэхнікуму (пасрэднік), Палей—начальнік штабу, Левін—загадчык АПО АК ЛКСМБ, Агітпроп Гомельскага райкому партыі і інш.**

Сярод шматлікіх пытаньняў і адказаў, значная частка якіх ці заблытана, ці недастаткова сформулявана, мы знаходзім і такія пэрлы творчасьці: Задаецца пытаньне.—„Што больш небясьпечна: правы ці „левы“ ухіл?

Адказваюць:—„небясьпечны абодвы. Так, як вядзем мы барацьбу з „левымі“, так мы вядзем барацьбу і з правым ухілам“. Пасрэднік дае заключны адказ: Здавальняюча.

Такая трактоўка пытаньняў–зусім няправільная. Тав. Сталін у адказах колгасьнікам гаварыў, што „галоўная небясьпека ў нас правая, правая небясьпека была ў нас і застаецца галоўнай небясьпекай. „Гэтая цытата з усёй яскравасьцю падкрэсьлівае, што правая небясьпека зьяўляецца галоўнай. Аднак, было-б вялізнай памылкай рабіць вывад з гэтага, што мы не павінны змагацца з адрыжкамі троцкізму, з рознай мнімай „левай“ фразай. Лёзунг партыі—барацьба на два фронты з концэнтрацыяй агня на правым, як больш небясьпечным ухіле і прымірэнцтве застаецца і на далей. Адсюль зусім відавочна ўся нікчэмнасьць, усе патугі гэтых гора-„кіраўнікоў“ да таго, каб затушаваць барацьбу з правым ухілам, як з галоўнай небясьпекай, адсюль і няправільная орыентацыя мас.

У нас няма мажлівасьці больш поўна затрымацца на гэтым надзвычайна важным політычным пытаньні, але і гэтага даволі, каб паказаць, што кіраўнікі політ-бою нават не дадумаліся пагдядзець у артыкулы тав. Сталіна, ня кажучы ўжо аб тым, што як відаць, не заглядалі і ў асноўныя пытаньні Ленінізму.

Надзвычайна важным зьяўляецца пытаньне правільнай орыентацыі комсамольскай організацыі ў пытаньні політыкі партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы. Аднак, у Гомелі опортуністыя і тут знашлі лазейку, каб працягнуць свае антыпартыйныя погляды.

На запытаньне: „Якія мэтады мы ўжываем для выцясьненьня кулака?“ даецца з адобрэньнем штабу такі адказ: „Мэтады адміністрацыйныя. Мы забіраем у кулака яго гаспадарку, высылаем яго ў Салаўкі, высылаем яго з вёскі і г. д...“

Вось і нова-выпечаная тэорыя „левых“ загібшчыкаў да пытаньняў ліквідацыі кулацтва, як клясы. Партыя вуснамі тав. Сталіна гаворыць, што: „Асноўным мэтадам ажыцьцяўленьня лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы, зьяўляецца мэтад колектывізацыі. Усе іншыя меры павінны быць прыстасаваны да гэтага асноўнага мэтаду. Усё тое, што супярэчыць гэтаму мэтаду, або паслабляе яго значэньне, павінна быць адкінута. У Гомелі-ж думаюць наадварот.

Толькі „левыя“ фразёры могуць думаць, што лёзунг ліквідацыі кулацтва як клясы можна ажыцьцявіць „у адзін прыём“,—адным загадам.

Лінія партыі заключаецца ў тым, што практычнае ажыцьцяўленьне лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы мы праводзім толькі ў раёнах суцэльнай колектывізацыі і на базе яе. Лёзунг ліквідацыі кулацтва як клясы ёсьць асноўны генэральны лёзунг партыі. Але ў тых раёнах, дзе колгасны рух яшчэ не атрымаў масавага разьвіцьця, дзе слаба прышлі ў рух батрацка-бядняцкія масы, мы пакідаем лёзунг абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў, але не як галоўны, а як лёзунг дапаможны ў адносінах галоўнага лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы.

Узаконьваць–жа мэтады адміністраваньня без адпаведнай экономічнай базы, без мобілізацыі батрацка-бядняцкіх мас, як гэта зрабілі ў Гомелі, гэта азначае ісьці па лініі простай дзялёжкі кулацкіх гаспадарак сярод індывідуальнікаў, што ў сваю чаргу азначае ісьці мэтадамі раскулачваньня 18-19 г.г. і зусім не адпавядае на даным этапе політыцы партыі. Ажыцьцяўляць на справе гэтую тэорыю, г. зн. ажыцьцяўляць тэорыю „левых“ загібшчыкаў, г. зн. ліць ваду на млын іх саюзьнікаў—правых опортуністых.

Ня менш абураючае вырашэньне ў час правядзеньня політ-бою атрымала наступнае пытаньне:

— „У чым корань памылак па сялянскаму пытаньню ў справе колектывізацыі?“

Даецца адказ:

— „Корань памылак заключаецца ў тым, што не ва ўсіх мясцох, але ў большасьці, колгасы былі організаваны не на добраахвотных пачатках, а адміністрацыйным парадкам“.

Пасрэднік дае заключэньне: „правільна“.

Гэта—паклёп на лінію партыі. Тут працягваецца думка з тым, каб апошліць колгасны рух, прадставіць яго як вынік адміністрацыйных дзейнічаньняў. Але яна не атрымала належнага адпору. Сама трактоўка гэтага пытаньня зусім няправільная, небальшавіцкая. Тав. Сталін па гэтаму пытаньню пісаў, што корань памылак у сялянскім пытаньні заключаецца: „у няправільным падыходзе да серадняка, у дапушчэньні гвалту ў галіне гаспадарчых суадносін з серадняком. У забвеньні таго, што гаспадарчая змычка з серадняцкімі масамі павінна будавацца не на падставе гвалтоўных захадаў, а на падставе згоды з серадняком, на падставе саюзу з серадняком. У забвеньні таго, што асновай колгаснага руху ў даны момант зьяўляецца саюз рабочай клясы з беднатой і серадняком супроць капіталізму наогул, супроць кулацтва ў асаблівасьці“.

Упускаць гэта—азначае ўпускаць самае а с н о ў н а е, самае галоўнае. Вось якраз гэтага ў Гомелі відавочна не зразумелі, а можа быць і зразумелі, але па-свойму. Зводзіць-жа памылкі да таго, што большасьць колгасаў утворана адміністрацыйным парадкам, значыць узводзіць паклёп на лінію партыі. Партыя нікому не давала права адміністраваць, партыя давала і дае па руках усім ушчэрпрышыбеевым, хто думае адміністрацыйна будаваць колгасы. Тыя перагібы і скажэньні лініі партыі, якія мелі месца, „выкліканы на падставе нашых хуткіх посьпехаў у галіне колгаснага руху“. Гэтыя посьпехі „закруцілі галаву“ некаторым работнікам і яны, замест упартай работы сярод асноўных мас сялянства, замест сапраўднай організацыі ініцыятывы да колгаснага руху, ганяліся за дутымі лічбамі колектывізацыі, забылі ўказаньні партыі. У гэтым іменна існасьць, а ня ў тым, што большасьць колгасаў утворана адміністрацыйна.

Зусім няма ніякай патрэбы даводзіць усю нікчэмнасьць гэтых „тэорэтыкаў“ у тых пытаньнях, дзе яны ўзьвялі паклёп на Цэнтральны Орган Партыі—„Праўду“ даводзячы, што яна пропагандавала організацыю колгасаў на базе абагуленьня дробнай жывёлы і птушак. Гэты паклёп уведзен гора-тэорэтыкамі з Гомелю. Уся яго нікчэмнасьць зразумела кожнаму.

Патрэбна дая паўнаты малюнку спыніцца яшчэ на некаторых пытаньнях, а іменна на пытаньні „адступленьня“. У Гомелі дагаварыліся да таго, што **правыя прапанавалі зьвярнуцца назад—да XIV парт. конфэрэнцыі—іменна таму, што там разьбіралася пытаньне аб ільготах для кулацкіх гаспадарак.** Гэты абураючы аргумант ня быў нікім абвергнуты.

Мімаволі паўстае пытаньне: што-ж рабілі кіраўнікі гэтага політбою?—Яны ўпарта маўчалі. Гісторыя партыі ня ведала, ня ведае і ня будзе ведаць такіх фактаў, калі-б наша партыя--партыя авангарду пролетарыяту разьбірала пытаньне аб „разьвіцьці і мацаваньні капіталістычных элемэнтаў і аб дапамозе ім“. Гэта можа сказаць чалавек, які або не мае нічога агульнага з партыяй, не разумее яе лініі, або чалавек з яўна-выяўленымі слабымі разумовымі здольнасьцямі.

Няма магчымасьці затрымацца паўней на цэлым шэрагу іншых пытаньняў, у прыватнасьці на нацыянальнай політыцы партыі, **якая была ў шэрагу формулёвак зусім скрыўлена, але на нашай думцы і гэтага даволі, каб зрабіць належны вывад з таго, як скрыўляюцца асноўныя прынцыпы марксызму і ленінізму, як некаторыя імкнуцца пад шыльдай рэволюцыйнай тэорыі** працягнуць анты-партыйныя погляды.

Нам здаецца, што Гомельскі акругком партыі і кіраўнічыя парторганы зробяць адпаведныя вывады з гэтага політбою. Нам зусім незразумела лінія бюро акругкомолу, якое з вялікім спазьненьнем (толькі пасьля рэзкіх выступленьняў на пленуме ЦК ЛКСМБ) узялося за выпраўленьне дапушчаных памылак.

Комсамольская організацыя Беларусі павінна вынесьці з гэтага політбою пэўныя цьвёрдыя вурокі. Гэты політбой фактычна яшчэ больш выразна падмацаваў асноўную лінію комсамолу аб неабходнасьці падняцьця тэорэтычнага ўзроўню ў комсамоле і ў першую чаргу сярод актыву. Штампоўшчыне, алілуйшчыне, беспрынцыпнаму дзяляцтву трэба палажыць канец. Трэба ўзброіць да „зубоў“ ленінскі комсамол рэволюцыйнай тэорыяй з тым, каб яшчэ больш энэргічна, больш рашуча весьці барацьбу за генэральную лінію партыі.

А. Джэлюк.

Прызнаю свае памылкі!

За правільнае тлумачэньне і правядзеньня лініі партыі

Я, як член штабу і прадстаўнік Акругкомолу, узяўшы вялікую адказнасьць за ўзьняцьце політ-бою на адпаведную політычную вышыню, за політычную чоткасьць, яскравасьць у растлумачэньні ўсіх пытаньняў партыйнай лініі, павінен быў не дапусьціць ніякіх скажэньняў, блытаніны, даць рашучы адпор усім, хто-б іх ні дапушчаў.

У час ходу політ-бою „міжнароднікам“ былі дапушчаны няправільныя, партыйна-нявытрыманыя політычна-шкодныя адказы на шэраг пытаньняў, якія па сутнасьці зводзяцца да права-опортуністычных тлумачэньняў.

Штаб нерашуча рэагаваў на гэтыя зьявішчы, ня прыняў захадаў да большага растлумачэньня гэтых пытаньняў на месцы, не зьмяніў адразу «міжнародніка», чым дапусьціў політычную памылку. Лічу неабходным падкрэсьліць дапушчаныя асабіста мною наступныя памылкі:

1. Улічваючы правілы політ-бою, я недастаткова і нерашуча рэагаваў, каб даваліся, больш яскравыя растлумачэньні на асобныя няправільныя адказы і адзнакі міжнароднікаў, не настойваў на неадкладнай замене апошніх, што па-сутнасьці зьяўляецца прымірэнцкімі адносінамі да дапушчаных скажэньняў у растлумачэньнях лініі партыі.

У заключнай прамове, я не заастрыў увагу на дапушчаныя памылкі міжнароднікамі штабу. У выніку гэтага політбой ня быў узьняты на адпаведную політычную вышыню. Прызнаючы гэта цалкам памылковым, лічу пастанову бюро АК ЛКСМБ па гэтаму пытаньню зусім правільнай.

На гэтых памылках мы павінны вучыцца, як праводзіць політ-баі ў далейшым, як узброіцца рэволюцыйнай тэорыяй, як заўсёды і ўсюды рашуча змагацца за чыстату марксыцка-ленінскай тэорыі, за правільнае правядзеньне і тлумачэньне лініі партыі.

З ком. прывітаньнем **Левін.**



Прымірэнча аднёсся

да праваопортуністычнай тэорыі

20-га красавіка г. г. быў праведзены політ-бой паміж двума буйнейшымі колектывамі гар. раёну (Гомель). Політбой ставіў асноўнай сваёй мэтай—праверыць наколькі комсамольская організацыя ўзброена марксыцка-ленінскай тэорыяй і наколькі комсамольская організацыя змагаецца за генэральную лінію партыі. Мною, як начальнікам штабу політ-бою, у час яго правядзеньня былі дапушчаны наступныя політычныя памылкі:

Недастаткова рашучае рэагаваньне на політычныя памылкі пасрэдніка ў тлумачэньні шэрагу політычных пытаньняў, якія апашлялі лінію партыі і цягнулі яе ў опортуністычнае балота.

Замест таго, каб зьняць пасрэдніка ў час політ-бою, баючыся за зрыў політбою, я яго заставіў і надалей пасрэднікам.

Лічу, што пастановы бюро Гомельскага АК і бюро гаркому ЛКСМБ, якія асуджаюць гэтыя памылкі і робяць орг. вынікі, зьяўляюцца цалкам і поўнасьцю правільнымі.

З компрывітаньнем **Б. Палей.**

Валынцы слаба падрыхтаваліся

27 красавіка Валынецкі РК КСМ правоўзіў політбой раённай арганізацыі.

Уся комсамолія раёну была падзелена на два ўзводы і ў двух пунктах раёну адбываліся політбаі. За час ходу політбою выявілася, што комсамольцы раёну вельмі слаба політычна надрыхтаваны. Асабліва слаба падрыхтаванай выявіла сябе Новоморская ячэйка ЛКСМБ.

Трэба зазначыць, што некаторыя комсамольскія ячэйкі нядбайна адносіліся да гэтага пытаньня, Нова-Шмехаўская нават не зьявілася на політбой.

Стаззонны.

Чыстка комсамольцаў-выпускнікоў ВНУ і тэхнікумаў

ПАВЫСІЦЬ ПОЛІТЫЧНА-КЛЯСАВУЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ВЫПУСКНІКОЎ

Кіраўніцтва комсамольскай організацыяй Мозырскага Белпэдтэхнікуму ня здолела організаваць масы комсамольцаў і студэнцтва на выжыцьцё ўсіх прарываў, якія мелі месца ў тэхнікуме

Ня гледзячы на тое, што гарадзкія ячэйкі комсамолу (Мозыр) прымалі зусім слабы ўдзел у чыстцы выпускных курсаў мазырскага белпэдтэхнікуму, за выключэньнем часткі рабочай моладзі фабрыкі „Чырвоны Кастрычнік" і „Профінтэрн", усё-ж чыстка прашла пад лёзунгам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, абгаварэньня ўсіх адмоўных бакоў у рабоце комсамольцаў III і IV курсаў.

Чыстка выявіла цэлы шэраг хваробных зьявішчаў, як у рабоце асобных комсамольцаў, так і ў рабоце ўсей організацыі мазырскага пэдтэхнікуму. Наяўнасьць нацыянал-дэмократызму, расейскага шовінізму, антысэмітызму, рвацтва, п'янства, сувязь з чужым элемэнтам, скажэньне клясавай лініі,—усё гэта мела месца ў мазырскім белпэдтэхнікуме. Ячэйка займалася „культурніцтвам", не абмяркоўвала і зусім не прапрацоўвала пытаньня аб колгасным руху, зусім не прапрацоўваўся статут сельскагаспадарчай арцелі. Адсюль зразумела, чаму пры чыстцы ніводзін комсамольцаў правільна не адказаў на пытаньні аб некаторых пунктах статуту.

Сыстэма „піскунізму"

Піскун—былы настаўнік пэдтэхнікуму па літаратуры, былы афіцэр, яры нацыянал-дэмократ, беларускі нацшовіністы, антысэміт, забараняў студэнтам выпісваць газэты і чытаць іх. „Гэта справа ня ваша, ваша справа—акадэмічная насьпяховасьць"—так гаварыў Піскун. Ен на працягу некалькіх год. будучы ў мазырскім пэдтэхнікуме, трымаў на сваёй кватэры двух студэнтаў і выкарыстоўваў іх, як яму толькі хацелася. Самакрытыка была ў поўным загоне таму, што Піскун здолеў узяць усё кіраўніцтва ў свае рукі.

У дні сьвяткаваньня Кастрычнікавай рэволюцыі Піскун прымушаў студэнтаў выступаць супроць пляну правядзеньня сьвяткаваньня. Сталымі яго падтрыманцамі зьявіліся кіраўнікі комсамольскай організацыі: ТАЛІЛА, МАЖАР, ВЕРАБЕЙ, КІСЯЛЕВІЧ.

Комсамольская організацыя тэхнікуму ўсё гэта бачыла, але яна не мобілізавала ўвагу ўсёй комсамолії і студэнцтва тэхнікуму на выжыцьцё хваробных зьявішчаў. Спадчына „піскунізму" мела месца і па сёньнешні дзень. Сам Піскун асуджан на пяць год з суровай ізоляцыяй і пазбаўленьнем права голасу. Сыстэма „піскунізму" ня толькі ўкаранілася ў асобныя колы студэнтаў, але і ў работу асобных зьвеньняў тэхнікуму.

Галерэя „кіраўнікоў"

ВЕРАБЕЙ—сын заможніка, член КСМ з 24 году, бацькі не зьяўляюцца членамі колгасу. Сам ён быў вылучаны адказным на грамадзкую работу ад бюро колектыву КСМ, на рабоце сябе не апраўдаў. У час зімовых вакацый, пры правядзеньні колектывізацыі нічога не зрабіў, будучы ў тэхнікуме імкнуўся ўвесь час атрымоўваць платную работу (атрымоўваў 130 р. у месяц, аднačасова і стыпэндыю). Членскія грошы ў комсамол плаціў як з 10 руб. У час пасылкі настаўнікаў на вёску адмовіўся ехаць з тае прычыны, што там малая плата—50 руб.

КІРПІЧНІКАЎ Б.—быў старшынёй профкому і апошні час АПО бюро колектыву, атрымаў вымову за прымірэнцкія адносіны да „піскунізму", закаранелы бюрократ, да работы адносіўся казённа. Калі да яго зьвярнуўся студэнт Загорац і назваў яго бюрократам, ён адказаў: „Як ты сьмееш гаварыць з чалавекам, які стаіць вышэй за цябе?" Зусім адарваны ад масы, трымаў сувязь толькі з кіраўнікамі тэхнікуму і Піскуном. Пры выбарах профкому настайваў на тым, каб у склад профкому ўвесьці сына жандара, соцыяльна-шкоднага элемэнта, бацька якога высланы за межы БССР. Найстайваў, каб далі стыпэндыю студэнтцы Шапіра, бацька якой быў буйным десапрамыслоўцам. Кірпічнікаў быў першым заціскачом самакрытыкі. Калі ў насьценгазэце аб ім быў зьмешчан артыкул, дык ён сарваў яго. У час чысткі прымаў усе захады, каб перашкодзіць яе нормальнаму ходу, групуючы вакол сябе спачуванцаў „піскунізму".

ГОВАР МАКАР—нацыянал-дэмократ. Будучы сэкратаром ячэйкі напісаў комсамольцам ліст з яўнашкоднай нам ідэалёгіяй. Говар не прыкмячае клясавай дыфэрэнцыяцыі і барацьбы на вёсцы; для яго ўсе сяляне толькі беларусы. Ён піша чыста абывацельскія, мяшчанскія пажаданьні сваім таварышам, політычна-блізарукі, цягнецца ў хвасьце мас.

ЗАГОРАЦ АЛЕСЬ на політгуртку настойліва патрабаваў, — куды дзець кулака і што з ім будзе; мае права-опортуністычны погляд на колектывізацыю, заўважваліся моманты антысэмітызму, расказваў антысэміцкія анэкдоты, сьпевы і г. д. Абавязкаў у комсамоле ня выконваў.

КІСЯЛЕВІЧ СЯМЕН — заможнік, бацька якога варожа настроены да колектывізацыі, выключан з колгасу, як шкодны элемэнт. У час зімовых вакацый п'янстваў, удзельнічаў у розных вячорках. У грамадзкай рабоце ніякага ўдзелу ня прымаў. Пры паступленьні ў комсамол скрыў сваё соцыяльнае паходжаньне і да апошняга часу атрымоўваў стыпэндыю, як селянін бядняк. Выступаў супроць колектывізацыі і раскулачваньня кулацтва. У час чысткі трымаў сябе вызываюча.

ТАМІЛА ПАЎЛЮК — серадняк. Пры праверцы высьветлілася, што Таміла—заможнік і скрыў сваё соцыяльнае становішча. Зьяўляўся лепшым сябрам Піскуна, дапамагаў Піскуну праводзіць яго контр-рэволюцыйныя справы.

МАЖАР РЫГОР—заможнік, маёмасьць бацькоў ацэньваецца ў 1700 рублёў і дом каля 1000 руб., антысэміт, падтрыманец Піскуна, п'яніца, політычна-няпісьменны, у



Піскун: Прычым тут я?

комсамол пралез з карыснай мэтай. Пры пасылцы ў вёску на правядзеньне пасеў-кампаніі нічога не зрабіў. Быў зьвязаны з бандытамі, якія зараз асуджаны.

Вось такія людзі пралезьлі ў комсамол і сталі на чале кіраўніцтва комсамольскай організацыі і грамадзкай работы тэхнікуму.

Дзе было АК ЛКСМБ?

Ня гледзячы на тое, што тэхнікум знаходзіцца пад носам акругкому комсамолу—усё-ж такі былы склад акругкому аказаўся блізарукім, ня здолеў мобілізаваць масу комсамольцаў тэхнікуму на зьнішчэньне хваробных зьявішч, якія мелі месца сярод студэнтаў і асобнага настаўніцтва, дапусьціўшы да кіраўніцтва шкодны кулацка-настроены элемэнт, скажаючым лінію партыі ў праводзімай рабоце. Былы сэкратар ячэйкі тав. Рэўт,—сын заможніка кіраваў усёй комсамольскай організацыяй тэхнікуму, які знаходзіўся пад уплывам Піскуна, і праводзіў яго мерапрыемствы ў жыцьцё. Такая політычная блізарукасьць акругкому спрыяла глыбокаму ўкараненьню ў колы пэдтэхнікуму „піскунізму" адміністраваньню, заціску самакрытыкі, нацыянал-дэмократызму, наогул розных шкодных праяў як у комсамольскай організацыі, так сярод ўсяго студэнцтва.

Як яны ўразумелі нацыянальнае пытаньне?

Пры праверцы нацыянальнай політыкі і белмовы сярод актыву тэхнікуму, высьветлілася, што актыў, за выключэньнем некаторых адзінак, ня ведае гісторыю Беларусі і асобных гістарычных падзей,—усё тлумачаць у яўна-шовіністычным духу. Асабліва гэта заўважана за студэнтам РЫБАКОВЫМ, які гаварыць: „КАЛІНОЎСКІ—ГЭТА РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ОРГАНІЗАЦЫЯ, ЯКАЯ ІСНАВАЛА Ў 60-Х ГАДОХ, КАСТРЫЧНІКАВУЮ РЭВОЛЮЦЫЮ РАБІЛІ СЯЛЯНЕ-ІНТЭЛІГЕНТЫ, ТАМУ ШТО РАБОЧЫХ ТУТ НЯМА".

Праверка высьветліла, што актыў у цэлым зьяўляецца політычна-няпісьменным, ня ведае нац. політыкі партыі, сутнасьць нацыянал-дэмократызму, шовінізму, антысэмітызму і г. д.

Комсамольскі колектыў у справе растлумачэньня сутнасьці нац. політыкі, а таксама памылак некаторых беларускіх пісьменьнікаў нічога не зрабіў. Само бюро колектыву тэхнікуму нерашуча праводзіла ў жыцьцё дырэктывы аб беларусізацыі, за што атрымала ад АК КСМ суровую вымову. Будучыя выхавальнікі дзяцей ня ведаюць самых элемэнтарных пытаньняў. На запытаньне: „Хто зьяўляецца вышэйшым органам савецкай улады?"—„студэнт Кагановіч адказвае: „Совнарком". Комсамолец Віславух не адказаў на пытаньне: „Што такое дыктатура пролетарыяту?"

Усяго прашло чыстку і праверку 28 членаў ЛКСМБ. З іх выключана з комсамолу за нацыянал-дэмократызм, шовінізм, антысэмітызм скажэньне клясавай лініі, сувязь з чужым элемэнтам і г. д.—17 чал. Вынесена 6 вымоў комсамольцам.


Чыстка і праверка комсамольцаў 3-га і IУ курсаў прайшла пры актыўным удзеле комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, але ўскрытыя прарывы ставяць перад Мазырскім тэхнікумам, у асаблівасьці перад комсамольскай організацыяй, пытаньне аб пераглядзе ўсёй комсамольскай організацыі тэхнікуму і становішча ўсяго тэхнікуму.

Б'ём трывогу

Атмосфэра ў тэхнікуме толькі разрадзілася, але каб поўнасьцю ўскрыць хваробныя праявы—трэба мобілізаваць усю комсамольскую організацыю, усё беспартыйнае студэнцтва. Гэтае пытаньне асабліва востра паўстае перад комсамольскай організацыяй, таму што тэхнікум напалову засьмечаны чужым нам элемэнтам. Сама комсамольская ячэйка, ня гледзячы на выяўленыя недахопы, змазвае свае памылкі, ня хоча ведаць і не асуджае іх. Калі прадстаўнік АК ЛКСМ зрабіў заўвагу, што так пытаньня ставіць нельга, што трэба ўскрыць усе недахопы ў рабоце ячэйкі, а потым праверыць становішча тэхнікуму, дык сэкратар ячэйкі выцірае сьціркай гэтае пытаньне і піша: „Аб хваробных зьявішчах у ячэйцы".

Каб ачысьціць і аздаравіць работу ўсяго тэхнікуму патрэбна неадкладна прагледзець соцыяльнае становішча ўсіх студэнтаў. На ўсе прарывы патрэбна зараз-жа мобілізаваць усю комсамольскую організацыю і беспартыйнае студэнцтва на поўнае зьнішчэньне іх, на разгортваньне сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі.

ЕРМАЛАЕЎ ЦІМОХ
І ЮДЗЕНЬКОЎ Р.



ПРАЭКТ ДОМУ АКАДЭМІІ НАУК

Усебеларуская Конфэрэнцыя Пролетстуду

16-га мая конфэрэнцыя заслухала даклад т. Аляксандрава аб працы ЦБ Пролетстуду пры УсеЦСПС і справаздачу ЦБ Пролетстуду БССР.

Увесь дзень ішлі спрэчкі па дакладах. Выказалася больш 25 чал.

Выступіўшыя дэлегаты паказалі на цэлы шэраг недахопаў, якія перашкаджаюць падрыхтоўцы кадраў. ЦБ Прелетстуду БССР ня трымаў сувязі з беларускім землячтвам у Маскве, Ленінградзе, Кіеве і інш. гарадох. Зусім слабое кіраўніцтва новаорганізаванымі навучальнымі ўстановамі (Рэчыцкі, Лепельскі Белпэдтэхнікумы). Профсаюзныя організацыі саюзу асьветнікаў ня цікавяцца жыцьцём і працай студэнцтва і ня кіруюць імі.

З боку ЦБ Пролетстуду, ЦСПСБ і Пролетстуду Беларусі было шмат цыркулярнага папяровага кіраўніцтва і кожны з іх (цыркуляраў) супярэчыў адзін аднаму. Жывое кіраўніцтва студэнцкімі організацыямі было слабое. Інструктар ЦБ Пролетстуду Гусаў, які абсьледваў становішча студэнцтва ў БССР, не даваў ніякіх практычных паказаньняў студэнцкім організацыям, а корпаўся ў архівах.

У Белпэдтэхнікумах зусім значная рабочая праслойка. Пролетстуду гэтага пытаньня рашуча ня ўздымала. Асаблівую ўвагу конфэрэнцыя зьвярнула на студэнцкаму друку, які да гэтага не зьяўляецца кіруючым органам. Часопіс „Чырвонае Студэнцтва" друкуе матар'ял толькі маскоўскіх ВНУ, а з другіх рэспублік зьмяшчае мала.

Матар'ялы аб працы і становішчы студэнцкіх організацый ні адна з акруговых і цэнтральных газэт, за выключэньнем „Чырвонай Зьмены", ня друкуюць.

Дэлегат Ярм...

Памятка юнсельнора

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Пасеўны плян па БССР выканан толькі на 29,6 проц. Такое становішча стварае пагрозу зрыву—комсамольскія ячэйкі павінны быць першымі барацьбітамі за організаванае скančэньне сяўбы. Пішэце, ці ячэйкі праяўляюць ініцыятыву ў гэтым напрамку, як праходзіць сяўба, пашырэньне плошчы, ці дапамагаюць саўгасы і колгасы індывідуальным бядняцка-серадніцкім гаспадаркам?

„Чырвоная Зьмена" прыняла выклік „Комсамольскай Праўды" па агляду організацыі працы ў колгасах. Пішэце: як організавана праца, як працуюць брыгады, ці выконваюцца нормы выпрацоўкі, ці практыкуецца зьдзельная работа, як практычна робіцца разьлік за працу. Абавязкова напішэце аб удзеле комсамольскай ячэйкі ў працы вытворчых нарад і наогул як яны працуюць.

Комсамол павінен даць 2 мільёны тон сілосу,—як выконваецца плян сілосаваньня і сяўбы сілосных кармоў. Што практычна робяць ячэйкі, колгасы, сельсаветы, коопэрацыя і іншыя ўстановы? Ці забясьпечаны сілосныя ямы будаўнічым матар'ялам? Раім вам організаваць налёты на гэтыя організацыі і праверыць, што робіцца ў справе таньнях сілосаваньня. Аб гэтым неабходна напісаць ў газэту.

Пішэце, як організавана праца сярод батрацтва і беднаты ў вашым колгасе, якую працу сярод батрацка-бядняцкай моладзі праводзіць комсамольская ячэйка.

Організаванае скančэньне сяўбы павінна ў выніку даць і старанную падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Што робяць ячэйкі для таго, каб да ўборачнай кампаніі падыйсьці падрыхтаванымі?

Рэдакцыя чакае ад вас матар'ялу па гэтых пытаньнях у бліжэйшы час.

З тав. прывітаньнем Рэдакцыя.

Паштовая скрынка.

Сачнёву—„Патрэбна савецкая мятла". Глазу—„Пра партыйца Ральзевіча". Осіпаву—„Заява". Леўкаму кавалерыстаму—„Гнаць чужды элемэнт са школы". Л. К. Фуоман—„Сыны контррэволюцыонэраў займаюць пасады у Савецкіх установах". Савецкі... „Вылучэнец-пятлюравец". К... ніку—„Ня мейсца падкулачніку ў ...шай пролетарскай школе". ... „Бюрократцтва". Свайму—„Ан... вецкія шовіністычныя выступле... 1-ай Менскай школе". Знаючаму... му не абложан кулак Грынкевіч... дар". Ерманоў У.—„Бандыты ... мел". Коля Рчоскін—„Дакуль гэта ... лве". Крыніцы—„Ціж гэта жыць...". Жык—„Аб Гомельскай чыгу... школе"—вышэй пералічаныя ... пасланы ў адпаведныя ўстановы і ... нізацыі для расьсьледваньня і пры... ця належных захадаў.

Іно—„Глядзяць па галоўцы". ...пішчыку—„Бюрократ". Мухе—„Г... пераліўка". Яначке—Роман К... „Трэба мятла", Інтэрнацыяна... Антысэміту ня месца ў савецкай ... ле". В. Ч.—„Вон шкоднікаў з агра... Комсамольцу—„Студэнты—абыва...—вышэй пералічаныя допісы з-за ... бязі фактаў ня могуць быць зьме... ны ў газэце. Іх можна выкарыс... у насьценгазэце і ўрэгуляваць на ... месцы.

Яловы—„Л. К." работае". Н... рысту—„Ратуйце". Паташоў—„Л... на фронце". Жыгальені—„Трэба ... равіць сельсавет". Алесь Вя... „Атрад „Л К" за працай", група ... пры Астрайскай ячэйцы ЛКСМБ ... вышэйпералічаныя допісы ў га... зьмешчаны ня будуць.

Магілеўскі АК ЛКСМБ

мобілізуе 30 чал. на рахунковую працу ў колгасы

Магілеўскі АК ЛКСМБ намеціў адчыніць у Магілеве курсы па падрыхтоўцы рахункаводаў у колгасы з разьлікам на 30 чалавек.

Бюро АК ЛКСМБ прапанавала ўсім райкомам зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасны адбор мобілізаваных комсамольцаў, пасылаючы галоўным чынам рабочых, батракоў і бедняко́ў-колгасьнікаў, забясьпечыўшы склад мобілізаваных ня менш 30 проц. дзяўчат.

Комсамол паставіў пытаньне перад Акркалгассаюзам аб сваечасовай падрыхтоўчай рабоце з яго боку да адчыненьня курсаў, забясьпечаньні курсаў выкладчыкамі і сродкамі на ўтрыманьне курсантаў.

Комсамольская організацыя разам з акруговым і райколгассаюзамі павінны шырока растлумачыць політычную важнасьць курсаў, організаваўшы вакол гэтага мерапрыемства належную грамадзкую думку.

Б. ЛІЎШЫЦ.

Адказны рэдактар —Рэдкол...

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599